# Каб крыўдна не было

Дарога на русакоўскія могілкі падзяліла дзядулеў маёнтак на дзве часткі – дом з прысядзібным агародам і асобна сад са склепам. Дарэчы, у садзе раслі вельмі смачныя грушы – Слуцкія бэры. Праўда, калі іх дзядуля садзіў, то яны давалі першы ўраджай праз 18 год.

Дык вернемся да русакоўскіх могілак. Яны ўмоўна падзелены на тры часткі: старыя (другая палова XVIII – першая палова XIX ст.); сярэднія (другая палова XIX – першая XX ст.) і новыя (другая палова XX і да сённяшняга дня). Калі мне было гадоў сем-восем, бацька вадзіў мяне па ўсіх могілках. Ужо тады старыя могілкі былі добра заросшыя хмызняком, які мне, сямігадоваму хлопцу, быў у пояс.

У тым хмызняку бацька паказваў мне магілку нашага далёкага продка Фабіяна (прозвішча ў яго іншае) з помнікам, які пакасіўся ад часу, і надпісам на польскай мове. Але гэта не значыць, што род Давідоўскіх быў цалкам каталіцкім. Католікамі была і сям'я таго Фабіяна. А можа і не. Сёння, відаць, і не пройдзеш да тых старых могілак.

Недалёка ад галоўнага ўваходу знаходзяцца магілкі дзеда Апанаса, бабулі Марылькі і бацькавага швагра Аляксандра. Дарэчы, Аляксандр быў чалавекам з вялікім пачуццём гумару. Калі ЦК КПСС узначальваў Л.І. Брэжнеў, то ў майго дзядзькі Сашы карова прынесла двух бычкоў, а гэта бывае вельмі рэдка (звычайна нараджаецца адно цяля), то аднаго дзядзька назваў Лёнік, а другога – Толік. Мы якраз прыехалі ў Русакі. Бацька спытаў у дзядзькі Сашы: «Саша, Лёнік – зразумела хто, а Толік хто?» А дзядзька адказвае: «А то ж наш старшыня калгаса, каб яму таксама крыўдна не было». Вось такі быў бацькаў швагер Саша.

**Зміцер ДАВІДОЎСКІ,**
г. Мінск